Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_____________М.А.Бяспалая
___”__________2017 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
__________М.А.Яцэвіч
___”__________2017 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)

Складальнік:
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства, кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.М. Нароўская

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 20 чэрвеня 2017 г.
пратакол № 10

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складальнік:

*Нароўская А.М., дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*

Рэцэнзенты:

*С.А. Сергачоў, доктар архітэктуры, прафесар, загадчык кафедры архітэктуры жылых і грамадскіх будынкаў УА “Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт”;*

*М.М. Елінская, кандыдат гістарычных навук, кансультант аддзела выкарыстання дакументаў і інфармацыі Дэпартамента па архівам і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь.*

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:

*кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*(пратакол ад 29 сакавіка 2017 г. № 8);*

*Советом факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый*
*(пратакол ад 2017 г. № )*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ


1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 6

**АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ**

2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 9

2.1 План-канспект лекцыйнага курса 9

3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 14

3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў 14

4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 17

4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў 17

4.2 Пытанні для экзамена 17

5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 19

5.1 Тэматычны план 19

5.2 Асноўная літаратура 29

5.3 Дадатковая літаратура 30


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна–метадычны комплекс па курсу “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны”для студэнтаў спецыяльнасці 1-23 01 12 “Музейная справа і ахова гісторыка–культурнай спадчыны” (па напрамках) распрацаваны ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13.01.2011 г.; адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1–23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка–культурнай спадчыны 2013 г.; тыпавым вучэбным планам і графікам адукацыйнага працэсу. Вучэбна-метадычны комплекс “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны” прызначана для студэнтаў III курса спецыяльнасці “музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны”.

У працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты набываюць веды па пытаннях, звязаных з фарміраваннем заканадаўчай базы аховы помнікаў гісторыі і культуры, даведваюцца пра сістэму органаў аховы і іх паўнамоцтвах; уліку, захаванню і выкарыстанню гісторыка-культурных каштоўнасцей; знаёмяцца з асноўнымі відамі работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і г.д.

Мэта выкладання вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне фундаменту ведаў на падставе вывучэння дасягненняў сусветнай і айчыннай заканадаўчай базы ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Вывучэнне прадмета спрыяе падрыхтоўцы студэнтаў да практычнай дзейнасці, да больш паглыбленага аналізу заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны.. Авалоданне тэарэтычнымі і практычнымі навыкамі ў дадзеным кірунку спрыяе фарміраванню ўсебакова спецыяліста ў галіне музейнай справы.

Актуальнасць дадзенага курса вызначаецца яго роляй у працэсе падрыхтоўкі навуковых супрацоўнікаў музейных устаноў.

У выніку вывучэння курса “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны” студэнты павінны ведаць:

– гісторыю станаўлення аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;
– асноўныя этапы і крыніцы фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;
– увесь комплекс характарыстык гісторыка-культурнай спадчыны;
– асноўныя прычыны страты і пагрозы ;знішчэння гісторыка-культурнай спадчыны;
– прынцыпы захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;
– навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне;

умець:

– аналізаваць крыніцы фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– даваць характарыстыку гісторыка-культурнай каштоўнасці і абгрунтаваць яе; ўключэнне ў Дзяржаўны спіс;

– вызначыць пагрозы існавання гісторыка-культурных каштоўнасцей;

– выкарыстоўваць найноўшыя навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Дысцыпліна "Ахова гісторыка-культурнай спадчыны" непасрэдна звязана з такімі дысцыплінамі, як "Археалогія", "Этналогія і этнаграфія Беларусі", "Гісторыя Беларусі", Гісторыя музейнай справы" і г.д.

Студэнты павінны валодаць:

– асновамі юрыдычнай абароны гісторыка-культурнай спадчыны;

–метадалогіяй фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Асноўнымі формамі навучання па дысцыпліне з'яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў..

Пры вывучэнні курса "Ахова гісторыка-культурнай спадчыны" выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і камп'ютарныя тэхналогіі.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Ахова гісторыка-культурнай спадчыны" вучэбным планам прадугледжана 122 гадзіны, з іх – 50 аўдыторных (лекцыі – 30 гадзін, семінары – 20 гадзін).

Форма кантролю ведаў – экзамен у першым і другім семестрах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

## 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 2.1 План-канспект лекцый

### Уводзіны

Вызначэнне, прадмет і задачы аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Агульная характарыстыка заканадаўства Беларусі ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (2006). Закон "Аб музеях і Дзяржаўным Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь (2005).

Асаблівасці заканадаўства аб ахове помнікаў у часы Расійскай імперыі. Агульныя вынікі развіцця заканадаўства да 1917 г.

Польскае заканадаўства ў галіне аховы помнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.). Страты помнікаў матэрыяльнай культуры пасля падпісання мірнага дагавора 1921 г. Таварыства аматараў навук у Вільні – культурным асяродку Заходняй Беларусі. Камісія па ахове помнікаў старажытнасці. Роля Ф.Рушчыца і сяброў камісіі Я.Булгака, Ю.Ромера, П.Багдзевіча. Беларускі краязнаўчы рух. Роля часопіса "Наш Край". Агульныя вынікі развіцця заканадаўства ў міжваенны перыяд (1918—1939 ).

### Раздзел I. Асаблівасці станаўлення і развіцця заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў 20-ыя гг. XX – пач. XXI ст

#### Тэма 1. Гісторыка-культурныя каштоўнасці і іх класіфікацыя

Вызначэнне паняцця гісторыка-культурнай спадчыны. Гісторыка-культурныя каштоўнасці і іх класіфікацыя. Матэрыяльныя каштоўнасці. Духоўныя каштоўнасці. Катэгорыі матэрыяльных і духоўных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Аб'екты ў складзе комплексных матэрыльяных каштоўнасцей. Матэрыяльныя каштоўнасці без катэгорыі. Прычыны змены эталонаў духоўных каштоўнасцей катэгорыі «Б».

#### Тэма 2. Асаблівасці станаўлення і развіцця заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў 20-40-ыя гг. XX ст.

Першыя дзяржаўныя органы па ўліку і ахове помнікаў. Асноўныя прынцыпы ахоўнай дзейнасці дзяржавы ў 20-40-ыя гг. XX ст. Першыя нарматыўныя акты Савецкай улады ў галіне музейнай справы і аховы помнікаў. Мастацка-археалагічныя камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва. Збор і ахова рухомых помнікаў гісторыі і мастацтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пастанова Саўнаркама аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, старажытнасцей, побыту і на
вакольнага асяроддзя.

Сістэма аховы, уліку і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны і рэгулявання яе ў 40-50 гг ХХ ст.

**Тэма 3. Заканадаўчыя асновы аховы помнікаў гісторыі і культуры ў 60-80-ыя гг ХХ ст.**

Першы Закон БССР «Аб ахове помнікаў культуры». Закон БССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры». Інструкцыі Міністэрства культуры па арганізацыі зон аховы нерухомых помнікаў гісторыі і культуры СССР.

Канстытуцыя СССР 1977 г. Парадак уліку, забеспячэння захаванасці, выкарыстання і рэстаўрацыі нерухомых помнікаў гісторыі і культуры. Пастанова Савета Міністраў БССР «Аб фактах грубых парушэнняў заканадаўства аб ахове помнікаў гісторыі і культуры». Рэкамендацыі аб забеспячэнні выканкамаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Зводам помнікаў гісторыі і культуры.

**Тэма 4. Заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў 90-ыя гг. ХХ – пачатку XXI ст.**

Новы перыяд у галіне аховы культурнай спадчыны краіны. Законы «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», “Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь”, “Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь”, “Аб асновах архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці”. “Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь”.

Нарматыўна-прававыя акты 2001—2003 гг. Пастанова Савета Міністраў РБ “Аб першачарговых мерах па захаванню і адраджэнні гістарычных цэнтраў гарадоў Беларусі”, “Аб пытаннях захавання гісторыка-культурнай спадчыны”, Палажэнне аб ахове археалагічных аб’ектаў. Праграма мерапрыемстваў па рэстаўрацыі палацава-паркавага ансамбля г.Нясвіжа і замкавага комплексу ў г. п. Мір. ЮНЕСКА, ІКОМ і іншых міжнародных арганізацый ў развіцці музейнай справы.

## Раздзел II. Кіраванне і кантроль ў галіне гісторыка-культурнай спадчыны

**Тэма 5. Сістэма органаў аховы помнікаў гісторыі і культуры, іх паўнамоцтвы ў Рэспубліцы Беларусь**

Асаблівасці дзяржаўнай палітыкі ў галіне ўліку і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Сістэма органаў аховы гісторыка-культурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спадчыны Беларусі.

Паўнамоцтвы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Задачы і функцыі Міністэрства культуры РБ. Кампетэнцыя і структура, задачы, функцыі і правы Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры РБ. Функцыі Навукова-метадычнай рады.

**Тэма 6. Сістэма органаў дзяржаўнага кіравання архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасцю**

Дзяржаўнае кіраванне ў XIX—пачатку XX ст. Дзяржаўнае кіраванне архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасцю ў БССР і Заходняй Беларусі ў XX ст. Паўнамоцтвы органаў архітэктуры і Дзяржбуднадзора ў галіне аховы помнікаў гісторыі і культуры. Асноўныя горадабудаўнічыя рэсурсы. Заказчыкі на праектаванне, рэканструкцыю і рэстаўрацыю будынкаў. Распрацоўка і зацвярджэне праектнай дакументацыі. Абавязкі заказчыка. Аўтарскі нагляд і кіраўніцтва. Віды парушэнняў заканадаўства аб архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці.

**Тэма 7. Функцыі і задачы Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ў раёнах, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС**

Дзяржаўная праграма па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. "Звод помнікаў археалогіі Чарнобыльскай зоны". Збор і апрацоўка звестак аб наяўнасці помнікаў гісторыі, архітэктуры і культуры ў населеных пунктах, якія падлягалі адсяленню. Унікальны фонд твораў традыцыйнай культуры і мастацтва.

Кансервацыя помнікаў і дэзактывацыя твораў мастацтва, каштоўных кніг, абразоў. Распрацоўка спосабаў іх захавання. Спыненне дзейнасці Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі . Дзейнасць экспедыцый Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі.

## Раздзел III. Дзяржаўны ўлік гісторыка-культурных каштоўнасцей

**Тэма 8.Улік гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь**

Выяўленне і вывучэнне гісторыка-культурнай спадчыны. Дакументальная навуковая фіксацыя. Крытэрыі адбору каштоўнасцей. Парадак надання статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці. Складанне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераліку матэрыяльных аб'ектаў і нематэрыяльных праяўленняў чалавечай творчасці, уласныя вартасці якіх недастатковыя для надання ім статуса каштоўнасці. Праблемы і перспектывы ўдасканалення дзяржаўнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей.

### Тэма 9. Структура Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей

Парадак уключэння аб'ектаў у Дзяржаўны спіс. Структура Дзяржаўнага спіса. Гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца ў межах рэспублікі. Легальнае знаходжанне каштоўнасцей па-за межамі Беларусі. Гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія незаконна знаходзяцца па-за межамі РБ. Каштоўнасці пад пагрозай знікнення або знішчэння. Перагляд Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей РБ і яго публікацыя. Комплексныя каштоўнасці ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей. Пазбаўленне статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці. Мадэльны закон СНГ аб аб'ектах культурнай спадчыны. Дзейнасць і функцыі банка звестак.

Недахопы парадку дзяржаўнага ўліку культурных каштоўнасцей. Праблемы і перспектывы ўдасканалення дзяржаўнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі з улікам міжнародна-прававых актаў СНД.

### Тэма 10. Захаванне і выкарыстанне аб'ектаў гісторыка-культурных каштоўнасцей

Захаванне каштоўнасцей у Расійскай імперыі. Дзяржаўная, царкоўная і прыватная маёмасць. Нацыяналізацыя прыватных каштоўнасцей у 1917-1918 гг. Сітуацыя ў Заходняй Беларусі, СССР. Забеспячэнне аховы асяроддзя матэрыяльных нерухомых каштоўнасцей. Рэжым утрымання і функцыянальнага выкарыстання іх пры рэканструкцыі гістарычных населеных пунктаў. Зоны аховы нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. Інструкцыя па арганізацыі зон аховы нерухомых помнікаў гісторыі і культуры . Праекты зон аховы. Індывідуальныя ўмовы ўтрымання і выкарыстання матэрыяльных каштоўнасцей. Рэжымы ўтрымання зон аховы. Ахоўныя дошкі. Форма і змест ахоўнай дошкі.

## Раздзел IV. Уласнасць на аб'екты, маючыя гісторыка-культурную каштоўнасць

### Тэма 11. Формы ўласнасці на аб'екты гісторыка-культурнай каштоўнасці

Формы ўласнасці на аб'екты, якія маюць гісторыка-культурную



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасць. Права ўласнасці. Парадак заключэння ахоўных абавязацельстваў. Правы і абавязкі ўласнікаў. Парадак змены ўласніка гісторыка-культурнай каштоўнасці. Абмежаванне правоў уласніка і карыстальніка матэрыяльнай каштоўнасці.

Вызначэнне ўмоў арэнды каштоўнасцей. Палажэнне аб парадку здзяйснення рамонту і рэканструкцыі жылых памяшканняў (кватэр) у шматкватэрных дамах г. Мінска. Дазвол на выкананне капітальнага рамонту кватэры.

## Тэма 12. Уласнасць на прадметы Дзяржаўнага музейнага фонду Рэспублікі Беларусь

Закон «Аб музеях і Дзяржаўным музейным фондзе Рэспублікі Беларусь». Задачы Дзяржаўнага музейнага фонду РБ. Склад Дзяржаўнага музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Віды музеяў па формах ўласнасці. Шляхі камплектавання Дзяржаўнага музейнага фонду РБ. Уключэнне музейных прадметаў і музейных калекцый у Дзяржаўны Музейны фонд Рэспублікі Беларусь і іх выключэнне. Цэнтралізаваны ўлік музейных прадметаў і калекцый. Роля экспертных камісій Міністэрства культуры і фондава-закупачных камісій музеяў. Кантроль за станам і выкарыстаннем Дзяржаўнага музейнага фонду Рэспублікі Беларусь.

## Тэма 13. Прыватызацыя жылых памяшканняў у дамах, якія з’яўляюцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю

Закон ад 22 чэрвеня 2001 г. “Аб прыватызацыі жыллёвага фонда ў Рэспубліцы Беларусь”. Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21 верасня 2001 г. “Палажэнне аб прыватызацыі жыллёвых памяшканняў у дамах дзяржаўнага жыллёвага фонда, іх эксплуатацыі і рамонце”. Умовы прыватызацыі жылых памяшканняў у дамах (кватэрах), якія з’яўляюцца гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі.

## Тэма 14. Вызначэнне права ўласнасці на гісторыка-культурныя аб’екты і каштоўнасці, якія не маюць уласніка

Вызначэнне права ўласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія не мелі ўласніка. Нерухомыя і рухомыя матэрыяльныя каштоўнасці. Нерухомыя матэрыяльныя каштоўнасці, знойдзеныя ў складзе ці на тэрыторыі аб’екта, якому нададзены статус каштоўнасці. Рухомыя матэрыяльныя каштоўнасці і эталоны духоўных фіксаваных каштоўнасцей, знойдзеныя ў складзе ці на тэрыторыі аб’екта, якому нададзены статус

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасці і які не мае банкаўскіх актываў. Права ўласнасці на духоўныя фіксаваныя каштоўнасці. Прававыя вынікі знаходкі скарбу. Грамадзянска-прававыя вынікі безгаспадарчага выкарыстання гісторыка-культурных каштоўнасцей.

## Раздзел V. Аднаўленне гісторыка-культурнай спадчыны

### Тэма 15. Віды работ на аб'ектах, маючых гісторыка-культурную каштоўнасць

Віды работ на матэрыяльных і духоўных фіксаваных каштоўнасцях. Галоўныя віды рамонтных работ. Натурныя даследаванні. Правядзенне навуковых даследаванняў. Аб'екты кансервацыі. Віды кансервацыі. Кансервацыя руін. Рэстаўрацыя і яе мэтазгоднасць. Методыка рэстаўрацыйных работ. Доўгатэрміновая праграма распрацоўкі і здзяйснення праектаў рэгенерацыі гарадской забудовы ў 2002-2015 гг. Правядзенне даследчых работ па вызначэнні межаў гістарычных цэнтраў гарадоў. Выкананне гістарычных даследаванняў, інвентарызацыі і паспартызацыі гістарычнай забудовы. Зоны аховы ў гістарычных гарадах.

### Тэма 16. Парадак правядзення работ на аб'ектах, маючых матэрыяльную каштоўнасць

Прававая паслядоўнасць арганізацыі навукова-даследчых, праектных і рэстаўрацыйных работ на помніках. Сістэма атрымання і выдачы адпаведнай зыходна-дазваляючай дакументацыі, яе структура. Сертыфікаты на правядзенне работ на матэрыяльных каштоўнасцях. Сістэма атрымання дазволу на даследаванне археалагічных аб'ектаў. Прафесіянальнае выяўленне матэрыяльных аб'ектаў або нематэрыяльных праяўленняў чалавечай творчасці, надзеленых статусам каштоўнасці. Парадак правядзення работ на матэрыяльных каштоўнасцях.

### Тэма 17. Паўнамоцтвы навуковага кіраўніка пры правядзенні навукова-праектных і рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на аб'ектах, што маюць гісторыка-культурную каштоўнасць

Навуковае кіраўніцтва і прававая роля навуковага кіраўніка ў арганізацыі і правядзенні навуковых, праектных і вытворчых работ па рэстаўрацыі. Адказнасць навуковага кіраўніка за захаванне адрозных якасцей і унікальных фрагментаў гісторыка-культурных каштоўнасцей. Роля аўтарскага нагляду ў дасягненні якасці рэстаўрацыйна-вытворчых работ. Вызначэнне чарговасці фінансавання работ па захаванні і аднаўленні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыяльных гісторыка-культурных  каштоўнасцей.

## Тэма 18. Ахова малых гарадоў (мястэчак)

Малыя гарады, як крыніца і захавальніца гістарычнай і культурнай спадчыны  Мястэчкі Беларусі  і спецыфічныя асаблівасці іх планіроўкі. Выяўленне і захаванне своеасаблівасці малых гарадоў. Захаванне прынцыпаў развіцця і рэгіянальнай спецыфікі. Аднаўленне і ахова каштоўных і значымых будынкаў малых гарадоў. Праблемы ўдасканалення архітэктурнага і прасторавага асяроддзя невялікіх гарадскіх пасяленняў. Архітэктурны Савет краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (АССЕЕ). Міжнароднага саюза архітэктараў у г.Стамбуле.

## Тэма 19. Ахова і прыстасаванне помнікаў грамадзянскага дойлідства

Гістарычныя цэнтры гарадоў і прадмесці. Гістарычныя ансамблі і сучаснае будаўніцтва. Ахова і выкарыстанне помнікаў горадабудаўніцтва. Помнікі грамадзянскага дойлідства, іх аднаўленне і адаптацыя. Навучальна-адукацыйныя збудаванні, іх захаванне і прыстасаванне. Паштовыя станцыі і вакзалы, іх выкарыстанне. Тэатральна-відовішчныя збудаванні. Іх захаванне і прыстасаванне. Корчмы, рэстараны, гасцініцы як асобная катэгорыя аб’ектаў грамадзянскага дойлідства, іх захаванне. Гандлёвыя рады, іх захаванне і прыстасаванне. Гістарычнае жылое асяроддзе: прыклады захавання і адаптацыі. Гістарычныя аб’екты манументальнай архітэктуры і іх уключэнне ў структуру горадабудаўнічай забудовы і гарадской рэкрэацый.

## Тэма 20. Ахова і прыстасаванне помнікаў народнага дойлідства

Пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні ў Рэспубліцы Беларусь Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Структура музея. Праблемы фарміравання музеяў пад адкрытым небам.  Актуальнасць выяўлення помнікаў драўлянага дойлідства. Аптымальныя формы захавання і прыстасавання да сучасных умоў помнікаў народнага дойлідства. Формы і метады захавання помнікаў драўлянай архітэктуры. Рэстаўрацыя вырабаў з дрэва. “Археалагічнае дрэва”. Метад кансервацыі “археалагічнага” дрэва. Методыка прафесара Віхрова. Этнаграфічныя экспанаты з дрэва і іх захаванне.  Рэстаўрацыя драўлянай скульптуры і мэблі. Праблемы захавання помнікаў драўлянага дойлідства.

## Тэма 21. Ахова помнікаў прыроды (музей валуноў, камяні)

Першыя Пастановы СНК БССР аб ахове помнікаў прыроды. Ахова помнікаў прыроды ў Заходняй Беларусі. Сістэматычная ахова унікальных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб’ектаў. Пастанова Савета Міністраў БССР “Аб ахове помнікаў прыроды на тэрыторыі Беларускай ССР”.  Роля акадэміка АН БССР Г. Гарэцкага. Музей валуноў – помнік прыроды рэспубліканскага значэння (Мінск, 1975). Унікальныя помнікі мінулага – язычніцкія капішчы і арыентаваныя камяні. Мінскае язычніцкае капішча і яго лёс. Крыжы і стоды. Барысавы камяні і месца іх захавання. Камяні краўцы-шаўцы, Чортавы камяні, Дажджбогаў камень, Вялесавы камяні, Пярун-камяні.

## Тэма 22. Актуальнасць праблемы захавання паркаў

Актуальнасць праблемы захавання паркаў і асноўных элементаў гістарычнага паркавага ландшафту. Класіфікацыя паркаў па ступені іх захаванасці і па стылявых асаблівасцях. Меры па захаванню паркавых кампазіцый, збудаванняў.

Рэгулярныя  і рэгулярныя тэрасныя паркі. Рэгулярныя паркі перыяду эклектыкі. Пейзажнае паркабудаўніцтва. Пейзажныя паркі перыяду рамантызму. Пейзажныя натуралістычныя паркі. Пейзажныя паркі перыяду эклектыкі. Асаблівасці архітэктуры і садова-паркавага мастацтва Беларусі у другой палове XIX– пачатку XX ст. Асаблівасці рэканструкцыі гістарычных паркаў. Меры па захаванні паркавых кампазіцый, збудаванняў. Паляпшэнне і папярэджэнне магчымых разбурэнняў без змен планіроўкі.

Структура аховы і выкарыстання помнікаў прыроды і экалогіі: запаведнікі і заказнікі на тэрыторыі Беларусі, нацыянальныя паркі, эка-музеі. Гісторыка-культурны запаведнік «Заслаўе». Нацыянальны гісторыка-культурны запаведнік «Нясвіж».

## Тэма 23. Помнікі археалогіі, ахова і іх выкарыстанне

Прадмет археалагічных раскопак. Ахова археалагічных аб’ектаў пад час земляных і будаўнічых работ. Правілы заключэння і выканання дамоў будаўнічага падраду. Праектна-каштарысная  дакументацыя на правядзенне земляных і будаўнічых работ. Правы, абавязкі і меры па ахове археалагічных аб’ектаў.

Хартыя Міжнароднага савета помнікаў і славутых мясцін (ICOMOS) па ахове і выкарыстанні археалагічнай спадчыны. Еўрапейская археалагічная канвенцыя. Падводная археалогія, як новы кірунак гістарычнай навукі. Канвенцыя ЮНЭСКА аб ахове падводнай культурнай спадчыны. Аб’екты падводнай культурнай спадчыны Беларусі.  Праблемы нелегальнага скарбашукальніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 24. Дакументальныя помнікі.
### Формы і метады іх захавання

Распрацоўка прававой і нарматыўнай базы па захаванні дакументальных помнікаў. Дзяржаўны ўлік дакументальных помнікаў. Палажэнне аб Нацыянальным фондзе кніжных помнікаў РБ. Праект “Мэтавая праграма па захаванні, кансервацыі і рэстаўрацыі дакументальных помнікаў”.

Стварэнне нацыянальнага міжведамаснага цэнтра захаванасці дакументаў на падставе сучасных тэхналогій. Капіраванне, мікрафільмаванне і факсімільнае ўзнаўленне арыгіналаў. Сучасныя камп’ютэрныя тэхналогіі. Лабараторыя кансервацыі і рэстаўрацыі дакументаў. Стварэнне CD-ROM. Праблема захаванасці і забеспячэнне доступу да помнікаў.

## Раздзел VI. Прававая рэгламентацыя вытворчасці раскопак вайсковых захаванняў

### Тэма 25. Асаблівасці захавання мемарыяльных помнікаў

Пахавальная абраднасць і эвалюцыя светапогляду чалавека. Камяні-помнікі і арэалы іх распаўсюджвання. Драўляныя крыжы і арэалы іх распаўсюджвання. Каваныя і літыя чыгунныя крыжы. Архітэктура могілкавых помнікаў. Мемарыяльная скульптура. Фамільныя некропалі, саркафагі. Захаванне мемарыяльных помнікаў.

Мэты і задачы ўшанавання памяці загінуўшых абаронцаў Айчыны. Асноўныя формы ўшанавання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў. Мемарыяльныя комплексы. Надмагільныя помнікі. Хроніка “Памяць”. Стварэнне мемарыяльных музеяў. Дзяржаўны ўлік воінскіх пахаванняў.

### Тэма 26. Парадак вытворчасці раскопак вайсковых захаванняў

Інструкцыя Міністэрства абароны ад 9 красавіка 1997 г. “Аб парадку правядзення раскопак месцаў баёў, не улічаных вайсковых пахаванняў і месцаў гібелі абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны падчас правядзення пошукавых работ з мэтай эксгумацыі рэшткаў загінуўшых з наступным іх пахаваннем (перапахаваннем) і увекавечаннем». Органы, адказныя за вытворчасць раскопак вайсковых пахаванняў. Роля мясцовых выканаўчых органаў па ўшанаванню памяці абаронцаў Айчыны. Рэспубліканская праграма па увекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны. Пошукавая работа з раскопкамі на мясцовасці. Рэкагнасцыроўка аб’екта. Раскопкі на тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

Афармленне дакументацыі зробленых раскопак. Даведка аб выніках



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праведзеных пошукавых работах на аб'екце. Інфармацыйныя аркушы з картаграфічным матэрыялам. Схемы размяшчэння палявога лагера і знойдзеных рэшткаў воінаў, ахвяр войнаў. Роля дзейнасці Упраўлення па ўшанаванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў пры Міністэрстве абароны Рэспублікі Беларусь.

## Раздзел VII. Адміністрацыйная і крымінальная адказнасць за парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей

### Тэма 27. Парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны

Асноўныя парушэнні заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Невыкананне патрабаванняў ахоўных абавязацельстваў у адносінах да гісторыка-культурных каштоўнасцей. Не паведамленне аб передачы правоў уласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнсці. Парушэнне парадку і ўмоў вытворчасці работ з гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі.

Пашкоджанне гісторыка-культурных каштоўнасцей. Парушэнне рэжыму ўтрымання аховы асяроддзя гісторыка-культурных каштоўнасцей.

### Тэма 28. Кантрабанда гісторыка-культурных каштоўнасцей і яе вынікі

Заканадаўчыя акты, рэгулюючыя парадак перамяшчэння культурных каштоўнасцей праз мяжу і таможню. Пастанова "Аб устанаўленні забарон і абмяжаванняў на перамяшчэнне рэчаў праз таможаную мяжу РБ". Тэндэнцыі ў галіне нелегальнага звароту культурных каштоўнасцей. Кваліфікацыя кантрабанды культурных каштоўнасцей па прызнаку здзяйснення яе. Вызначэнне статуса затрыманага прадмета кантрабанды.

Асноўныя шляхі вывазу старажытных прадметаў. Прыярытэтныя кірункі кантрабанднага перамяшчэння культурных каштоўнасцей праз заходнюю і ўсходнюю межы. Безлічны спосаб перамяшчэння культурных каштоўнасцей. Праблемы незаконнага вываза культурных каштоўнасцей праз таможню РБ.

### Тэма 29. Рэстытуцыя аб'ектаў, якія маюць гісторыка- культурную каштоўнасць. Праблема вяртання і сумеснага выкарыстання

Этымалагичнае паходжанне тэрміна «рэстытуцыя». Аб'екты рэстытуцыі. Першая Усебеларуская канферэнцыя архівістаў (1924). Мінскія, віленскія архівы, метрыка ВКЛ і інш. Вяртанне вывезеных архіўных збораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віцебскі архіў старадаўніх актавых кніг. Віленскі архіў (канец 1939 – пачатак 1940). Бібліятэка Я.Храптовіча XVIII ст.

Першы з'езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі (1926). Бібліятэка М.Х.Каладзеева. Бібліятэка Полацкай уніяцкай семінарыі. Другая канферэнцыя архівістаў БССР (1927).VI – VIII сесіі Вярхоўнага Савета БССР (1944) і яе вынікі. Пошук згубленых унікальных культурных каштоўнасцей у свеце (1940-80-я гг.).

Дзейнасць Беларускага рэспубліканскага аддзялення Савецкага фонду культуры і Міністэрства культуры. Роля Акадэміі навук БССР, Галоўнага архіўнага ўпраўлення рэспублікі, Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна. Дзейнасць Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі, кіраўнікамі і мастацтвазнаўцамі беларускіх музеяў у галіне рэстытуцыі. Спецыяльная праграма “Вяртанне”. Таварыства “Радзіма”.

Дзяржаўная камісія па рэстытуцыі. Міжнародныя дакументы (рэзалюцыі і канвенцыі ААН і ЮНЕСКА, пагадненні дзяржаў-удзельніц СНД, двухбаковыя міждзяржаўныя дамовы). Праблема вяртання разрабаваных і незаконна вывезеных культурных скарбаў і рарытэтаў. Роля беларускіх дзеячоў культуры і навукоўцаў.

## Тэма 30. Адміністрацыйная і крымінальная адказнасць за злачынствы супраць аб'ектаў, якія маюць гісторыка -культурную каштоўнасць

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР “Аб адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў аховы і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры” (1977). Указ Прэзідэнта СССР “Аб прыпыненні здзеку над помнікамі, звязанымі з гісторыяй дзяржавы і яе сімваламі” (1990). Аб прыпыненні выканання рашэння рэспубліканскіх і мясцовых органаў аб зносе, перамяшчэнні ці зменах мемарыяльных збудаванняў. Закон СССР “Аб крымінальнай адказнасці і адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне заканадаўства аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры” (1991). Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях (2003). Вытворчасць па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях ў галіне гісторыка-культурнай спадчыны. Тэрміны накладання адміністрацыйнага пакарання.

